ЧАМУ ПЕРАКРЫЛІ ВЕНТЫЛЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар. «МС».)

Віктар Мікалаевіч — актывіст, што называецца, ад бязвыхаднасці. Ён неаднаразова звяртаўся з вясковай праблемай да раённых і абласных улад, а таксама ў занальны і абласны цэнтры гігіены і эпідэміялогіі. У лісце ад санітарных службаў гаворыцца, што водазабеспячэнне жылых дамоў у аграгарадку Капцёўка адбываецца з гаспадарча-пітнога водаправода ЖКГ Гродзенскага раёна. Указваецца, што сістэма водападрыхтоўкі на водаправодзе адсутнічае. Дарэчы, раней вада паступала ад Гродзенскай птушкафабрыкі.

Што датычыцца лабараторных даследаванняў, то пробы вады з камунальнага водаправода адпавядаюць мікрабіялагічным нормам. А вось мутнасць і колькасць жалеза значна перавышаюць нарматывы. Напрыклад, жалеза — у восем разоў. Пры гэтым ніякія меры па ачыстцы і прамыўцы водаправода не далі вынікаў.

Наогул наяўнасць жалеза ў падземным гарызонце характэрная для ўсёй краіны, у тым ліку для Гродзенскага раёна. Звычайна з такой сітуацыяй спраўляюцца станцыі абезжалезвання альбо спецыяльныя фільтры непасрэдна ў жылых дамах.

— Напачатку нам сказалі, што будаўніцтва станцыі ў Капцёўцы запланавана на 2019 год. Гэта значыць, што нам яшчэ добры год карыстацца ржавай вадой, — кажа Віктар Дучэк. — Таму мы звярнуліся з просьбай уключыць тую свідравіну, якой мы карысталіся да гэтага часу. Але ў санстанцыі адказалі, што ў той вадзе значнае перавышэнне па нітратах. Да таго ж свідравіна, якая зараз належыць птушкафабрыцы, не мае агароджы, знаходзіцца ў дрэнным стане.

Жыхары, як адзін, упэўнены: вада, якой карысталіся раней, была чыстая і празрыстая. І пытанне па нітратах ніколі не стаяла так востра. Людзі перакананыя, што вырашэнне праблемы ляжыць на паверхні. Трэба толькі двум уладальнікам высветліць, хто каму будзе плаціць, і вярнуць былую схему. Насельніцтва ж плаціць за чыстую ваду, а не за брудную... З такімі разважаннямі я завітала ў Капцёўскі сельскі Савет.

«НЕЛЬГА ПАІЦЬ НАРОД НІТРАТАМІ»

Мне пашанцавала. **Старшыня сельсавета Іван СЛІЖЭЎСКІ** якраз быў на месцы. У адказ на пытанне «Як вырашаецца праблема з вадой?» Іван Яўгенавіч працягнуў мне пратакол даручэнняў губернатара ад 20 жніўня гэтага года. У ім сярод іншага быў і пункт, які датычыўся Капцёўкі. Адказным асобам было прадпісана набыць і змяніраваць абсталяванне для станцыі абезжалезвання да канца 2018 года. Гэта значыць, што станцыя будзе пушчана ў дзеянне ў паскораным рэжыме, амаль на год раней тэрміну. Практычна за некалькі месяцаў.

Старшыня сельскага Савета ведае сітуацыю, але паўплываць на яе не ў стане. Вада, якая паступае на птушкафабрыку, змяшчае нітратаў 58,4 мг/л пры норме 45. Для фермы гэта дапушчальная забруджанасць, а для насельніцтва — небяспечная. Таму браць на сябе адказнасць за вяртанне насельніцтву «нітратнай» свідравіны ён не збіраецца. Разам з тым пытанне аб паляпшэнні пітной вады з парадку дня не здымаецца. На думку Івана Сліжэўскага, на стан водаправода ў гаспадарцы даўно трэба было звярнуць увагу. Чаму 50 гадоў трубы не мянялі?

— Я тут восем гадоў працую, і ўвесь час вяліся ўгаворы: перадавайце водаправод на баланс ЖКГ, вы яго не эксплуатуеце, і гэта не ваша работа. Але ніхто гэтага не рабіў, пакуль не прыйшоў новы кіраўнік, — зазначыў старшыня сельсавета.

Па яго словах, на баланс птушкафабрыкі была перададзена кацельная, зроблены праект і ідзе замена цеплатрасы. Сёлета і на будучы год будуць добраўпарадкаваны свідравіны, пачнецца замена водапровада. Забяспечваць насельніцтва вадой гаспадарцы не пад сілу: гэта пагражае адключэннем вады ў вёсцы. Таму было прынята рашэнне перадаць на баланс ЖКГ дзве свідравіны, а дзве пакінуць на ўласныя патрэбы. Гэта тыя самыя «нітратныя», якія раней забяспечвалі вёску. Ізноў будуць ачышчаць труба-правод, гэту работу будзе праводзіць раённае ЖКГ.

— Рана ці позна, праблема гэта выйшла б напаверх, — зазначыў Іван Сліжэўскі. — Зараз яна можа вырашыцца хутчэй, бо паскорыцца будаўніцтва станцыі абезжалезвання. Пакуль яе няма, у школе і садку ставяцца фільтры для ачысткі вады.

Дырэктар сярэдняй школы Людміла САНЮКЕВІЧ паведаміла, што фільтры ўжо закуплены за кошт аддзела адукацыі райвыканкама. Да пачатку навучальнага года іх усталююць.

«СІТУАЦЫЯ З ВАДОЙ — АБУРАЛЬНАЯ»

Стан вады ў Капцёўцы пад пастаянным кантролем санітарных службаў. Пробы бяруцца амаль штотыдзень. Вядзецца назіранне за прамыўкай водаправодных сетак. Але гэта ненадоўга паляпшае сітуацыю, бо жалеза ўсё роўна назапашваецца ў водаправодзе.

На думку **галоўнага санітарнага ўрача вобласці Мікалая КЕНДЫША,** сітуацыя з вадой у Капцёўцы склалася абуральная. На тэрыторыі населенага пункта, аказваецца, не чатыры, а восем свідравін. Але адна не працуе, другая — закансерваваная, трэцяя — затампанірываная... Вельмі цяжка разабрацца ў тэхнічных магчымасцях свідравін, якія маюць розных уладальнікаў, адзначыў Мікалай Кендыш. Праблема, якая сёння турбуе людзей, крыецца ў мінулым, калі калгас «разбазарваў» свідравіны, і ЖКГ цяпер не хоча іх браць на баланс з-за дрэннага стану.

Мікалай Кендыш прызнае: камунальнікі дапусцілі памылку, бо пераключылі свідравіны без усялякага аналізу сітуацыі і яе наступстваў. Да таго ж неабходна было правесці інфармацыйную работу з насельніцтвам, а потым прымаць меры і пераключаць той вентыль. Гэта зроблена не было. У сваю чаргу, жыхары, якія атрымалі ржавую ваду, не хочуць мірыцца з такой сітуацыяй. Дарэчы, у вобласці некалькі сотняў населеных пунктаў, куды паступае вада з перавышэннем колькасці жалеза. Актуальная і тэма нітратаў. Галоўны санітарны ўрач канстатуе: гэтыя рэчывы перавышаны ў былой свідравіне, але спынілі яе эксплуатацыю яшчэ і з-за недахопу вады.

Зараз камунальныя службы тэрмінова шукаюць шляхі вырашэння гэтых праблем. Па словах **генеральнага дырэктара ЖКГ Гродзенскай вобласці Алега ШАФРАНСКАГА,** пазбегнуць уздзеяння нітратаў, магчыма, калі паглыбіць свідравіны, і гэта часткова зроблена. Але ўзнікла праблема жалеза. Для яго ачысткі неабходна пабудаваць станцыю, і на гэта выдзелена 42 тысячы рублёў. Алег Шафранскі ўпэўнены, што модуль будзе ўведзены ўжо ў лістападзе. Але для вырашэння праблемы неабходна будаваць воданапорную вежу з рэзервуарам чыстай вады. Тады можна гаварыць аб бесперабойнай яе падачы.

Відавочна, што сітуацыя з іржавай вадой — гэта безгаспадарчасць былых уладальнікаў свідравін і недальнабачнасць сённяшніх. Можна бясконца раскладваць гэту праблему па частках, і яны быццам бы даволі лагічныя. Гэта і старыя сеткі, і нітраты, і недахоп вады... Але расплачваюцца за гэтыя хібы чамусьці жыхары вёскі, а іх — ні многа, ні мала — каля тысячы чалавек.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

КАМПЕТЭНТНА

МОЖНА НЕ КІПЯЦІЦЬ

Ці можна піць ваду з-пад крана без кіпячэння, колькі ў ёй можа змяшчацца жалеза і ці бяспечнае яно для нашага здароўя, а таксама хто павінен сачыць за якасцю вады з калодзежа — пра гэта расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

— Згодна з санітарнымі правіламі і нормамі пітная вада, якая падаецца цэнтралізаванымі сістэмамі, павінна быць эпідэмічна бяспечнай, бясшкоднай па хімічным складзе і валодаць спрыяльнымі арганалептычнымі ўласцівасцямі. Яна не можа змяшчаць хваробатворныя бактэрыі, вірусы і найпрасцейшыя мікраарганізмы і мусіць адпавядаць нарматывам па мікрабіялагічных і паразіталагічных паказчыках. Таксама ў вадзе не павінна быць біялагічных агентаў і хімічных рэчываў.

Абследаванні вады ажыццяўляюцца па мікрабіялагічных і санітарна-хімічных паказчыках. У адпаведнасці з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя вада лічыцца бяспечнай у эпідэміялагічных адносінах, калі колькасць проб, якія не адпавядаюць гігіенічным нарматывам па мікрабіялагічных паказчыках, не перавышае 5 %. У Беларусі ў 2018 годзе неадпаведнасць па названых паказчыках была зарэгістравана ўсяго ў 0,8 % проб. Таму ваду з-пад крана без кіпячэння і дадатковай ачысткі ўжываць цалкам бяспечна.

Асноўнымі крыніцамі водазабеспячэння ў краіне з'яўляюцца падземныя воды. На асобных тэрыторыях з-за гідрагеалагічных асаблівасцяў фарміравання яны характарызуюцца павышанай колькасцю жалеза. Злучэнні жалеза не аказваюць таксічнага дзеяння на арганізм чалавека, аднак садзейнічаюць павелічэнню мутнасці і колернасці, што абмяжоўвае выкарыстанне вады ў санітарна-бытавых мэтах.

Пры наяўнасці ў пітной вадзе жалеза ў канцэнтрацыі большай за 0,3—0,5 мг/л арганалептычныя ўласцівасці пагаршаюцца, а пры канцэнтрацыі вышэйшай за 1,5—2 мг/л вада, акрамя мутнасці і афарбоўкі, набывае непрыемны вяжучы смак. Таму колькасць жалеза ў водаправоднай вадзе не павінна перавышаць 0,3 мг/л. Па рашэнні мясцовых улад да правядзення адпаведных мерапрыемстваў (будаўніцтва станцый абезжалезвання, выбар новай крыніцы водазабеспячэння і інш.) можа быць устаноўлены часовы нарматыў колькасці жалеза — 1 мг/л.

У Мінску для абясшкоджвання вады часткова выкарыстоўваецца метад хларыравання. Надзейны эфект дасягаецца ў тым выпадку, калі пасля абясшкоджвання ў вадзе застаецца 0,3—0,5 мг/л свабоднага хлору ці 0,8—1,2 мг/л звязанага хлору, што сведчыць пра дастатковую колькасць уведзенага абеззаражвальнага агента. Наяўнасць рэшткавага хлору ў вадзе рэгулярна вызначаюць у лабараторыі, а таксама не радзей чым раз на суткі адбіраюць пробу вады для бактэрыялагічнага даследавання. У 2017-м і бягучым гадах па выніках лабараторных даследаванняў у пітной вадзе з размеркавальнай сеткі Мінска перавышэнняў колькасці рэшткавага хлору не выяўлена.

Што датычыцца такіх крыніц водазабеспячэння, як грамадскія шахтавыя калодзежы, то адказнасць за іх эксплуатацыю, санітарны і тэхнічны стан нясе арганізацыя, на балансе якой яны знаходзяцца. У апошнія гады назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя па зніжэнні колькасці крыніц нецэнтралізаванага водазабеспячэння, якія не адпавядаюць устаноўленым нормам, у тым ліку і па якасці вады. За апошнія 10 гадоў іх колькасць знізілася з 15,3 % да 4,1 %.

> У Беларусі ў 2018 годзе неадпаведнасць па названых паказчыках была зарэгістравана ўсяго ў 0,8 % проб. Таму ваду з-пад крана без кіпячэння і дадатковай ачысткі ўжываць цалкам бяспечна.

Наколькі бяспечная і прыгодная для ўжывання вада з індывідуальных калодзежаў, якімі зараз карыстаюцца пераважна ў сельскай мясцовасці, іх уладальнікі могуць даведацца, здаўшы ваду на даследаванне. Выконваюць гэту працэдуру ў тэрытарыяльным цэнтры гігіены.

Алена КРАВЕЦ.